*Наталля Морнева*

# "ПАХВАЛА О ВЕЛИКОМ КНЯЗИ ВИТОВТЕ" Ў БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІМ ЛЕТАПІСАННІ

"Пахвала о великом князи Витовте" – арыгінальны помнік старажытнага беларускага пісьменства, што неаднаразова звяртаў на сябе ўвагу вучоных. Як адзначала даследчыца летапісання М.Ф. Антонава, "княжацкая пахвала – самастойны тып летапіснага апавядання" [Антонова 1974, 153]. Аднак гэты тып летапіснага аповеду дастаткова не даследаваны.

Што ў беларускім літаратуразнаўстве разумеюць пад выразам "пахвала о великом князи Витовте"? Сёння можна сустрэць тры значэнні гэтага старабеларускага выразу: 1) не як назва асобнага твора ці часткі летапіснага аповеду, а самастойнае словазлучэнне "пахвала вялікаму князю Вітаўту" – панегірык, хвалебныя словы [Гісторыя 1998]; 2) як назва складковай часткі беларуска-літоўскіх летапісаў, якая, магчыма, існавала як асобны твор [Чамярыцкі 1969]; 3) як назва летапіснага тэксту, які ідзе пасля падзагалоўка "Пахвала о великом князи Витовте".

У пачатку XX ст. М. Грушэўскі ў артыкуле "Пахвала вялікаму князю Вітаўту, колькі заўваг пра склад найдаўнейшага руска-літоўскага летапісу" [Грушевский 1895] разглядаў гісторыю стварэння часткі летапісу, што змяшчае пахвалу Вітаўту, закранаў пытанні пра рэдакцыі "Пахвалы о великом князи Витовте". Беларускі даследчык В.А. Чамярыцкі таксама звяртаўся да вывучэння пахвалы ў межах I зводу беларуска-літоўскага летапісання. Так, В.А. Чамярыцкі гаворыць, што "Пахвала о великом князи Витовте" – "своеасаблівы і цікавы помнік беларускай сярэдневяковай літаратуры" [Чамярыцкі 1969, 85]. Аналізуючы змест і кампазіцыю пахвалы, В.А. Чамярыцкі між тым не звяртаў дастатковай увагі на жанравыя асаблівасці гэтай часткі летапісу, адзначаючы толькі тое, што пахвала не адносіцца да твораў эпічнага жанру, не з'яўляецца гістарычнай аповесцю і мае панегірычны характар.

В.А. Чамярыцкі адзначаў , што "Пахвала о великом князи Витовте" "вельмі блізкая да "Пахвалы гетману Астрожскаму". Калі гаворка ідзе пра "блізасць", то тут яна прасочваецца найперш у панегірычным настроі абодвух помнікаў. Што тычыцца зместу, структуры, кампазіцыі і спосабу падачы матэрыялу, то тут ёсць істотныя, на наш погляд, адрозненні. Папершае, "Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму", змешчаная ў Кіеўскім скарочаным і Валынскім кароткім летапісах, выглядае як арганічная частка летапіснага помніка. Нягледзячы на тое, што гэты помнік адрозніваецца ад "Пахвалы о великом князи Витовте" большым уплывам літаратурнай традыцыі (аб чым сведчаць кніжныя метафары і параўнанні), усхваленне князя Астрожскага арганічна выглядае ў тэксце летапісу і гэтая пахвала не ўспрымаецца як асобны ад летапісу помнік. Князь Вітаўт у "Пахвале о великом князи Витовте" не раскрываецца ў дзеянні, не паказваецца ў развіцці, калі ж гаворка ідзе пра князя Астрож-

скага (“Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму”), то ўсхваленне змяшчае і апісанне яго подзвігаў, аповед пра канкрэтныя ўчынкі, і апісанні яго станоўчых якасцей: “И како преиде до реки до Днепра под Оршою, градом каменным, и виде, яко бысть не борзо преходим путь водный, и яко богобоязнивый муж и справца военный, тот славный великий гетман бег до церкви святои” [Пахвала 2003, 369].

Нас цікавіць пытанне аб тым, у якім выглядзе захавалася “Пахвала о великом князи Витовте” у розных зводах беларуска-літоўскага летапісання.

Ужо ў спісах І зводу ёсць некаторыя разыходжанні ў падачы “Пахвалы о великом князи Витовте”. Так, у Слуцкім, Супрасльскім, Акадэмічным спісах тэкст самой пахвалы выдзяляецца падзагалоўкам. Аднак падзагалоўкі ў гэтых спісах адрозніваюцца: у Слуцкім і Супрасльскім спісах – “Пахвала о великом князи Витовте”, а ў Акадэмічным – “Сказание [о] великом князи Витовти”. Аднак, як адзначала даследчыца жанру пахвалы ў помніках усходнеславянскага летапісання М.Ф. Антонава, “у навуковай літаратуры гаварылася аб тым, што ў старажытнай літаратуры аднолькава называліся творы розных жанраў, якія рэзка адрозніваліся адзін ад другога і па тэматыцы, і па форме выкладу матэрыялу” [Антонова 1974, 150]. Такім чынам, выкарыстанне слоў “пахвала” і “сказание” ў дачыненні да аднаго і таго ж помніка неабавязкова сведчыць аб прыналежнасці гэтых твораў да жанру пахвалы ці да жанру сказання, а пацвярджае думку аб тым, што нярэдка адбывалася змяшэнне назваў “пахвала”, “сказание” пры найменні твораў аднолькава панегірычнага характару.

Рознае размяшчэнне пахвалы ў спісах І зводу дае падставы гаварыць аб тым, што пахвала з’яўляецца ўстаўкай у тэкст летапісу. У Слуцкім спісе пахвала размешчана пасля паведамлення пра смерць князя Вітаўта, а ў Супрасльскім – пасля Смаленскай хронікі. На думку некаторых даследчыкаў, размяшчэнне “Пахвалы о великом князи Витовте” ў Слуцкім спісе выглядае больш натуральным, бо адпавядае ўсходнеславянскай традыцыі ўсхвалення князя, калі хвалебныя словы з’ўляліся ў летапісе з нагоды смерці князя. Аднак, на думку В.А. Чамярыцкага, першапачатковае месца пахвалы – пасля Смаленскай хронікі. Тэкст “Пахвалы о великом князи Витовте” ў спісах І зводу амаль цалкам супадае.

Тэкст пахвалы ў спісах ІІ зводу (Красінскага, Рачынскага, Альшэўскім, Румянцаўскім, Еўраінаўскім) выдзелены аднолькавым падзагалоўкам “Пахвала о великом князи Витовте”. Нягледзячы на аднолькавы са спісамі І зводу падзагаловак, структура пахвалы ў спісах І і ІІ зводаў значна адрозніваецца. Пры параўнанні частак летапісаў І і ІІ зводаў, адразу ж звяртае на сябе ўвагу пачатковая частка пахвалы. У спісах І зводу яна пачынаецца з рытарычнага ўступу: “Таину цареву таити добро есть, а дела великого господаря поведати добро жь есть” [ПСРЛ 1978, 58]. У спісах ІІ зводу такі рытарычны ўступ адсутнічае. Наогул, у

спісах II зводу адсутнічаюць метафары і параўнанні са Святога пісання. У I зводзе метафары і параўнанні са Святога пісання ёсць. Калі пахвала спісаў I зводу распавядае пра славу Вітаўта, то ў спісах II зводу гаворка спачатку ідзе пра падрыхтоўку да каранацыі Вітаўта. У спісах I і II зводу ў тэкстах, змешчаных пад падзагалоўкам "Пахвала о великом князи Витовте", адрозніваецца храналагічны парадак падачы звестак. Так, у спісе Красінскага такі парадак: Вітаўт жадае каранавацца – палякі не прапускаюць карону – Вітаўт збірае гасцей – апісанне частаванняў гасцей – апісанне славы і магутнасці Вітаўта – паведамленне пра тое, што Вітаўт расхварэўся і памёр. У Супрасльскім спісе пасля падзагалоўка ідзе ўласна апісанне славы і магутнасці Вітаўта, але ў тэксце летапісу без усялякага падзагалоўка ёсць летапіснае паведамленне, падобнае да гэтак званай "Пахвалы о великом князи Витовте" з такім размяшчэннем звестак: Вітаўт збірае гасцей – апісанне частаванняў гасцей – Вітаўт жадае каранавацца – *паляне* не прапускаюць карону – паведамленне пра тое, што Вітаўт расхварэўся і памёр.

| I звод (летапіснае паведамленне, 1430 г.) | II звод (тэкст пасля падзагалоўка "Пахвала о великом князи Витовте") |
|---|---|
| Князь великии Витовт Кестутьевич созваша к собе короля польского Владислава, князя великаго московского Василия Васильевич и князя великого тверъского Бориса Александровича, и мистра немецького и пруськаго, мистра лифлянского и велици послы от Ивана царя царигородского и от римского цесаря приходили и от донского короля послы, и от великого князя рязанского *Иона*, и от *волского* воеводы послы приходили. *Подоевъскыя князи* сами были, от Великого Новгорода и отто Опскова, и ото ординского царя послы были, и ото иншых князеи и земель послы были. И тыи короли и велици князи и послы быша ў великого князя Витовта сем недель на его страве, а на день шло оборока по триста бочек меду, а яловиць триста, а баранов и вепров по триста. Князь великии Витовт хотел на себе положити коруну, и его не приняли поляне, не пропустиша коруны, и на тым не положи на себе коруны. И розбалися князь великии Витовть и роспусти князеи великих и послы цареви со многими дарами и с честию. А король польскыи Владислав бысть у князя великого Витовта и при нем преставися великии князь Витовт месяца октября 23 на паметь святого Якова, брата господня. (Супрасльскі спіс) [8, 57] | *И мешкаючи ему ў Великом Луцку и хотел был на себе коруну возложити и ею неприятели поляки не пропустили ему коруны.* И тогды призвал к собе короля польского Владислава, цесаря *римскаго с цесаревою*, московского великого князя Василия Василевича, *короля ўгорского с королевою*, и князь великии тверскии Борис Александрович был, и мистр прускии, немецкии и лифлянцкии мистр. И иншые великие послы были: от Ивана царя царягородского и от митского царя послы приходили, и от донского короля послы приходили, и от великого князя резанского послы приходили, и от *волоского* воеводы, и от иных немецких земель были. и мешкали вси тыи гости в великого князя Витовта сем недель на его страве, а за день выходило им оброку по пятисот бочек меду а по пятисот яловиц, по пятисот баранов, по пятисот вепров, а по сту зубрев, по сту лосеи , а инших речеи личбы нет. Тогды цесар римъскыи у великои милости был з Витовтом. И бывши ему во своем городе ў Луцку, и там тых гостеи честив и даровал розмаитыми дарами коштовными. И от того ся ўтвердила великая милость межи них, иж не можем выписати, о цти и о дарех того великого господаря. (спіс Красінскага) [8, 167] |

Як бачым, пачатковая частка тэксту спісаў II зводу, што абазначаны як “Пахвала о великом князи Витовте”, больш адпавядае летапіснаму паведамленню спісаў I зводу, чым тэксту, які ў I зводзе ідзе пад такім жа загалоўкам. Між тым, у спісах II зводу змешчаны тэкст, які пэўным чынам суадносіцца з тэкстам “Похвалы о великом князи Витовте”, па спісах II зводу. Такім чынам атрымліваецца, што тэкст “Пахвалы о великом князи Витовте” па спісах II зводу складаецца з трох частак: 1) паведамленне пра жаданне Вітаўта каранавацца і прыезд да яго гасцей; 2) аповед пра славу і магутнасць Вітаўта; 3) паведамленне пра смерць вялікага князя, прычым першая і трэцяя часткі суадносяцца з летапіснымі паведамленнямі спісаў I звода пад 1430 годам, а другая частка – з “Пахвалой о великом князи Витовте” па спісах I звода. Узнікае пытанне: складальнікі спісаў II зводу, пераапрацаваўшы пахвалу як асобны твор, арганічна ўключылі яе ў свой летапісны аповед ці ім наогул была невядома пахвала Вітаўту ў такім выглядзе, у якім яна захавалася ў спісах I зводу? Можна выказаць меркаванне, што “Пахвала о великом князи Витовте”, па спісах II зводу ўзыходзіць да летапіснага апавядання пра князя Вітаўта за 1428 год [ПСРЛ 1901, 153–154].

| Летапіснае паведамленне 1428 г. | I звод (па Супрасльскаму спісу) | II звод (па спісу Красінскага) |
|---|---|---|
| Те же велиции князи всех земель тех и языков, еже писахом здесе в книзе сеи, велику честь и дары подаваху славному господарю, великому князю Витовту, тако же и велики дары и дани приношаху ему не токмо на всяко лето, но и по вся дни. А от тых великих земель которому господарю повелеваше к собе быти, они без всякого ослушания прихожаху к нему с своих земель. Есть пак хочеть поити на которую землю, на них сам бываше коли гневен, или пак силных своих воевод где послати хощеть и ис которои земли которым государем веляше к собе быти, ино тех великих земель государи безо всякого ослушания приходять со всеми своими силами на помочь и на его службу [ПСРЛ 1901, 418]. | Тыи же велиции господари, велиции князи и велиции земли, иж писахом зде, ини во велиции любви живущи с ним, а иныи крепко служаху ему, славному государю, и честь велику и дары многи, и дани приношаху ему не токмо по вся лета, но и по вся дни. И коли славныи господарь, великыи князь Александр, зовемыи Витовт, на которую землю бываше гневен и которую землю хотяше сам казнити или пакы силных своих воевод послати где восхощеть, и которому от тех великых земель повелеваше к собе быти, и они безо всякого ослушания воськоре прихождаху со своея земли ко нему. И коему господарю не за какую нужу немощно быти, и он своя рати и силы послаше ко нему на помочь и на его службу [ПСРЛ 1978, 58]. | Тыи великии господари и цари, великии князи тые ў великои ласце с ним жили, а иныи служили ему и честь великую, и дары великие, и дани многие приносили ему не только во все лета, але на кождыи день. И коли славныи господарь великии князь Витовт на которую землю бывал гневен и хотел сказнити, а любо силных своих воевод где хотел послати, и кому коли от тых земель велел к собе быти, и они безо всякого ослушенства своеи земли пришли к нему и везде ему на помоч были, где коли ему было надобе [ПСРЛ 1978, 168]. |

Адзначым таксама і некаторыя адрозненні “Пахвалы о великом князи Витовте” ад тыповых княжацкіх пахвал ва ўсходнеславянскім летапісанні. Асновай княжацкай пахвалы ў летапісах XII–XIII ст. з’яўляўся аповед пра смерць і пахаванне князя, да чаго далучаліся характарыстыкі героя, паведамленне пра галашэнні па ім ці нават сам тэкст гэтых галашэнняў [1, 151]. Галоўным кампазіцыйным момантам такіх пахвал выступала характарыстыка князя, звычайна гэта было апісанне якасцей з пункту гледжання хрысціянскай маралі. Князь выступаў як “благоверный, христолюбивый, блаженный”, “благонравныи и любовь имяше ко всим” [ПСРЛ 1960, 610]. У “Похвале о великом князи Витовте” на першым плане станоўчыя якасці князя з пункту гледжання не рэлігійнай маралі, але свецкай. Так, тут гаворка не ідзе пра яго чалавечыя якасці, апісваецца толькі яго слава, улада і моц. Можна дапусціць, што такія змены пры ўсхваленні князя тлумачацца пазнейшым часам стварэння пахвалы Вітаўту. Аднак у “Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай”, якая не захавала асобнага летапіснага тэксту з падзагалоўкам “Похвала о великом князи Витовте”, змешчана характарыстыка Вітаўта менавіта як князя, што набліжаецца да хрысціянскага ідэалу: “пан то был чулыи, довсципу и розуму великого, мерныи в еденю и питю, ничого не пивал, тылко воду” [ПСРЛ 1975, 81]. У тым, як падаецца гэта характарыстыка князя і як наогул пабудавана паведамленне пра яго смерць у гэтым помніку, можна заўважыць наследаванне ўсходнеславянскай летапіснай традыцыі. Што ж тычыцца самой “Похвалы о великом князи Витовте”, па спісах I і II зводаў, то яна значна адрозніваецца ад тыповых “слов”, “сказаний” і іншых летапісных аповедаў, якія ўслаўлялі асобных князёў.

**Літаратура**


Антонова М.Ф. «Слово о житияи Дмитрия Ивановича, царя русьскаго» // ТОДРЛ. XXVIII. Л., 1974.

Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд / М.М. Грынчык, У.А. Калеснік, У.Г. Кароткі і інш.; Пад рэд. М.А. Лазарука. 4-е выд. Мн., 1998.

Грушевский М. Похвала великому князю Витовту, кілька ўваг про склад найдавнійшаі русько-літовьскоі літописи // Записки наукового товариства ім. Шевченка. Киів. Кн. 4. Т. 8. 1895.

Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму // Анталогія даўняй беларускай літаратуры. XI – першая палова XVIII стагоддзя. Мн., 2003.

Полное собрание русских летописей. Т. 2. М.-Л., 1960.

Полное собрание русских летописей. Т. 17. Л, 1901.

Полное собрание русских летописей. Т. 32. М., 1975.

Полное собрание русских летописей. Т. 35. М-Л., 1978.

Чамярыцкі В.А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры. Мн., 1969.